УДК 373.3.016:811.161.3

# РОЛЯ ПАЗАКЛАСНАЙ РАБОТЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў ВЫХАВАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

**Грышчанкова Алена Віктараўна**
выкладчык камісіі беларускай і рускай моў і методыкі іх выкладання
Горацкага педагагічнага каледжа ўстановы адукацыі
"Магілёўскі дзяржаўны ўнівсрсітэт імя А. А. Куляшова"
аг. Леніна, Рэспубліка Беларусь

**Анатацыя.** У артыкуле апісваецца сістэма мэтанакіраванай працы па выхававанні нацыянальнай самасвядомасці ў вучняў малодшага школьнага ўзросту сродкамі пазакласнай работы па беларускай мове.

Адной з асноўных задач адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца фарміраванне патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці. Нацыянальнае выхаванне дае магчымасць малодшым школьнікам далучыцца да самабытнай культуры, усвядоміць сваю прыналежнасць да нацыі, багатай сваімі традыцыямі і звычаямі, дасягненнямі ў галіне культуры, навукі, адукацыі [1].



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Нацыянальная самасвядомасць з'яўляецца духоўным здабыткам асобы, складае аснову яе жыццядзейнасці.

Малодшы школьны ўзрост з'яўляецца найбольш спрыяльным перыядам для авалодвання дзецьмі элементамі беларускай народнай культуры, бо менавіта ў гэты прамежак жыцця ў дзіцяці фарміруецца цікавасць і патрэба да ведаў. Аднак, як паказвае практыка, на сённяшні дзень вынікі працы ў дадзеным кірунку не вельмі высокія. Гэта, па меркаванні спецыялістаў [2], абумоўлена наступнымі прычынамі:

• у сувязі з недахопам ці адсутнасцю беларускамоўнай практыкі ў дзяцей недастаткова сфарміраваны камунікатыўныя якасці маўленчай дзейнасці;

• слоўнікавы запас малодшых школьнікаў вельмі абмежаваны;

• маўленне малодшых школьнікаў знаходзіцца пад моцным уплывам рускай мовы;

• дзеці недастаткова ведаюць беларускія народныя традыцыі, гульні і святы;

• вучні мала чытаюць беларускамоўныя літаратурныя творы;

• большая колькасць бацькоў увогуле не звяртаюцца да беларускай народнай культуры, не размаўляюць на роднай мове і не зацікаўлены ў тым, каб іх дзеці валодалі беларускай мовай на добрым узроўні.

Сёння сам час патрабуе ад нас звароту да сваіх вытокаў, а гэта значыць да далучэння дзяцей да беларускай нацыянальнай культуры, паглыблення знаёмства з родным краем, беларускімі традыцыямі, фальклорам, прывіцця пачуцця грамадзянскасці, любові да Радзімы. Трэба навучыць дзяцей з павагай ставіцца да беларускай мовы і выкарыстоўваць яе ў зносінах.

Вельмі важна не забываць і аб тым, што выхоўваць патрыятычныя пачуцці здольны толькі той настаўнік, які сам добра валодае роднай мовай, дасканала ведае нацыянальную класіку, адчувае гонар за беларускую культуру і можа перадаць гэтае адчуванне дзецям.

Таму перад настаўнікам пачатковых класаў сёння стаяць наступныя задачы: раскрыць дзецям багацце і непаўторнасць роднай мовы, пазнаёміць іх з лепшымі творамі беларускай дзіцячай літаратуры, з культурнай і гістарычнай спадчынай свайго народа, дапамагчы ўсвядоміць асноўныя рысы беларускіх звычаяў і традыцый і тым самым сфарміраваць нацыянальную самасвядомасць.

Зрабіць гэта толькі ў межах урокаў мовы і літаратурнага чытання немагчыма. Дабіцца вырашэння пастаўленых задач можна пры дапамозе добра наладжанай сістэмы мерапрыемстваў праз выкарыстан-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

не практыка-арыентаваных метадаў. Вялікую ролю ў гэтым адыгрывае арганізацыя пазакласнай работы па беларускай мове, далучэнне дзяцей да дзейнасці гурткоў мастацкай і краязнаўчай скіраванасці. Пры гэтым праца ў дадзеным кірунку павінна праводзіцца не час ад часу, а сістэматычна і мэтанакіравана.

Пазакласная работа дапаўняе ўрокі мовы і літаратурнага чытання. Прымаючы ў ёй удзел, вучні пашыраюць і замацоўваюць тыя веды, уменні, якія атрымалі на занятках у класе, а таксама маюць магчымасць пазнаёміцца з казкамі, вершамі, драматургіяй і іншымі выдатнымі творамі дзіцячай літаратуры, якія не ўключаны ў спіс абавязковых для вывучэння твораў.

Калі арганізаваць пазакласную работу правільна і ўмела, то яна будзе не толькі садзейнічаць развіццю ў вучняў інтарэсу да роднай мовы, але і выхаванню ў іх беражлівага стаўлення да слова, да багаццяў мовы, будзе развіваць імкненне не толькі авалодаць гэтымі багаццямі, але зберагчы і ўзбагаціць духоўны скарб беларускага народа.

У адрозненне ад урокаў, пазакласная праца заснавана на прынцыпе добраахвотнасці. Вучні самі, без прымусу займаюцца тым, што іх прываблівае і цікавіць, што ім больш падабаецца, а значыць, яны робяць дадзеную справу з жаданнем. Калі дзеці атрымліваюць асалоду ад сваёй працы, то ў іх адбываецца эмацыянальны ўздым, а гэта садзейнічае павышэнню эфектыўнасці навучання і выхавання.

Каб зацікаўленасць дзяцей да ўдзелу ў пазакласнай рабоце па беларускай мове не знікала, неабходна імкнуцца выкарыстоўваць яе розныя формы і віды. Звярнуўшыся да педагагічных крыніц і прааналізаваўшы іх, мы з навучэнцамі высветлілі, што існуе тры групы арганізацыйных форм пазакласнай работы:

– *масавая* (свята, вечарына, прадметны тыдзень і інш.) – гэта форма мерапрыемства, у падрыхтоўцы і правядзенні якой прымае ўдзел вялікая колькасць дзяцей; гэта могуць быць вучні розных узростаў, з розных класаў, не аб’яднаныя адным стабільным калектывам;

– *групавая* форма ўяўляе сабой вялікія творчыя групы, каманды, якія ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы да конкурсаў, віктарын, афармленні і выпуску інфармацыйных плакатаў, насценгазет;

– *індывідуальная* форма – гэта праца з вучнямі, якія атрымалі індывідуальныя заданні ці даручэнні пры падрыхтоўцы да мерапрыемстваў, выступаюць у ролі вядучых; праца з вучнямі, якія робяць спробы ў напісанні вершаў і іншых творчых работ.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Сярод мерапрыемстваў пазакласнай работы вылучаюць формы, якія дзейнічаюць пастаянна (праца гурткоў, музеяў, клубаў) і эпізадычныя (правядзенне моўных ранішнікаў, віктарын, конкурсаў, алімпіяд і інш.).

Вучням вельмі падабаюцца заняткі ў гуртку. Яны даюць ім магчымасць праявіць свае творчыя здольнасці, спрыяюць выяўленню інтарэсаў, раскрыццю ўнутранага свету, садзейнічаюць фарміраванню высокіх маральных і эстэтычных ідэалаў, выхоўваюць любоў і павагу да роднай мовы, развіваюць жаданне думаць і размаўляць па-беларуску.

На сёння ў школе найбольш папулярнымі зяўляюцца тры віды гурткоў:

– *гурток роднай мовы*, дзе вучні могуць замацаваць і паглыбіць веды, атрыманыя на ўроках;

– *моўна-творчы гурток,* асноўная мэта якога – падтрымаць жаданне дзяцей тварыць, г. зн. выказваць свае захапленні роднай мовай, прыродай, людзьмі, якія іх акружаюць, у сваіх творчых працах (вершах, апавяданнях, казках, сачыненнях і інш.);

– *моўна-гістарычны гурток* дапамагае рыхтаваць улюбёных у родную зямлю даследчыкаў, бо аб’ядноўвае вучняў, якія цікавяцца гісторыяй паходжання імён і прозвішчаў, назваў населеных пунктаў, маюць жаданне пазнаёміцца з легендамі, паданнямі пра цудоўныя мясціны роднага краю (напрыклад, “Адкуль пайшла такая назва?”, “Казкі, што пачулі мы ад бабулі…”). Заняткі такой скіраванасці дапамагаюць сфарміраваць у дзяцей веды аб родным краі, пачуццё прывязанасці да тых мясцін, дзе нарадзіліся і выраслі яны, іх бацькі і дзяды, з якімі звязаны яркія эмацыянальныя ўражанні саміх дзяцей.

Шырока выкарыстоўваюцца ў школьнай практыцы інтэграваныя гурткі, кірункамі працы якіх могуць быць мова і літаратура, мова і тэатр, мова і музыка і інш.

Пазнаёміўшыся з відамі і формамі пазакласнай працы, а таксама маючы асабісты вопыт работы ў драматычным гуртку, навучэнцы нашага педкаледжа пад час праходжання перадцыпломнай практыкі паспрабавалі наладзіць з малодшымі школьнікамі дзейнасць такога гуртка. На занятках яны знаёмілі сваіх выхаванцаў з разнастайнасцю жанраў беларускага дзіцячага фальклору: жартамі, пацешкамі, забаўлянкамі, казкамі і інш. Вучыліся іх выразна чытаць. Потым вучні пад кіраўніцтвам практыкантаў складалі сцэнарыі п’ес паводле казак, якія найбольш спадабаліся, размяркоўвалі ролі, развучвалі танцы і песні, выраблялі касцюмы, дэкарацыі. Вынікам працы было выступленне з казачным прадстаўленнем перад бацькамі і іншымі вучнямі малод-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

шых класаў, а таксама ў дзіцячым садку. Гурткоўцы атрымалі вялікае задавальненне ад таго, што іх выступленне ўсім вельмі спадабалася. Пачуцці і эмоцыі перапаўнялі іх. Гэта стала штуршком да таго, што ўсе ўдзельнікі гуртка загарэліся жаданнем і далей працаваць у дадзеным кірунку: знаёміцца з творамі беларускай дзіцячай літаратуры, абрадамі, святамі, развучваць і ставіць іх на сцэне. З вялікай пашанай пачалі адносіцца яны да роднай мовы, перасталі саромецца размаўляць на ёй, сталі імкнуцца авалодаць ёю больш дасканала. Поспех любой працы залежыць ад прадуманасці яе ажыццяўлення, спланаванасці. Гэта гаворыць аб тым, што калі работа з дзецьмі ў дадзеным кірунку будзе праводзіцца сістэматычна, то яна дасць добрыя вынікі.

Такім чынам, пераканаўшыся на асабістым вопыце ў эфектыўнасці пазакласнай работы па беларускай мове, мы можам зрабіць выснову аб тым, што разумна спланаваная дзейнасць, выкарыстанне разнастайных формаў і метадаў грамадзянска-патрыятычнага выхавання дапамогуць фарміраванню ў падрастаючага пакалення нацыянальнай годнасці і самасвядомасці. А гэта, у сваю чаргу, будзе садзейнічаць павышэнню самасвядомасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

## Спіс літаратуры

1. Канцэпцыя бесперапыннага выхавання дзяцей і моладзі ў Рэспубліцы Беларусь: пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 15.07.2015 № 182.

2. Паўлаў, С. В. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці сродкамі вуснай народнай творчасці / С. В. Паўлаў. – Мазыр : Белы Вецер, 2010. – 148 с.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова